**ВОДГУК**
**афіцыйнага апанента на радзе па абароне дысертацый Д2.21.02 пры Дзяржаўнай установе адукацыі «Беларускі педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»**
**доктара педагагічных навук, прафесара В.П.Таранцея**
**на дысертацыйнае даследаванне Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны «Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі»,**
**прадстаўленае на саісканне вучоной ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі)**

## 1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навук, па якіх яна прадстаўляецца да абароны

Аналіз зместу прадстаўленай дысертацыі, аўтарэферату, публікацый аўтара і іншых матэрыялаў дазваляе сцвярджаць, што дысертацыйная праца адпавядае паспарту заяўленнай спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі), зацверджанага ВАК. Тэма дысертацыі «Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі» цалкам адпявадае зместу дысертацыі і аўтарэферату.

## 2. Актуальнасць тэмы дысертацыі

Гісторыя суіснавання на адной сацыякультурнай прасторы дзвюх моў, якія з’яўляюцца парытэтнымі ў сваім функцыянальным статусе, спрыяла з’яўленню білінгвізму як своесаблівай моўнай сітуацыі, пры якой руская і беларуская мовы актыўна ўзаемадзейнічаюць. Паколькі сучасныя беларусы жывуць ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму і асноўныя камунікатыўныя працэсы адбываюцца на рускай мове, то стварэнне беларускага маўленчага адукацыйнага асяроддзя ў школах з рускай мовай навучання і выхавання паўстае найбольш актуальна, таму што гэта можа стаць шляхам карэкцыі незбалансаванага функцыянавання беларускай мовы і ўмовай паспяховага фарміравання білінгвальнай асобы. У сваю чаргу фальклор, які выступае сродкам стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя, называюць школай сацыяльнага вопыту, пазнавальнае значэнне якога праяўляецца ў адлюстраванні асаблівасцей рэальнага жыцця і перадачы праз фальклорныя творы ведаў пра грамадскія адносіны, працоўную дзейнасць і побыт. Ён з’яўляецца натуральнай мадэллю адлюстравання рэчаіснасці, дзе сканцэнтраваны назапашаныя веды, сацыяльны і практычны вопыт папярэдніх пакаленняў, якія праектуюцца на асобу малодшых школьнікаў ва ўмовах, прыбліжаных да рэальных

Актуальнасць даследавання вызначаецца таксама супярэчнасцямі паміж: парытэтным функцыянальным статусе дзвюх моў (рускай і беларускай) і

дамінаваннем рускай мовы ў камунікацыі над беларускай; аб’ектыўнай патрэбай грамадства ў білінгвальнай асобе, якая свабодна гаворыць, піша, выкарыстоўвае ў зносінах беларускую мову нароўне з рускай і адсутнасцю натуральнага беларускамоўнага асяроддзя; патэнцыялам фальклорных твораў для стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя і недастатковым выкарыстаннем яго магчымасцей у адукацыйным працэсе пачатковай школы.

Патрэба грамадства не толькі ў высокаадукаванай білінгвальнай, высокакультурнай асобе, інтэграванай у культуру свайго народа, што дазволіць ёй паспяхова адаптавацца да полікультурнага навакольнага асяроддзя; неабходнасць навуковага асэнсавання сутнасці, асаблівасцей і найбольш аптымальных сродкаў стварэння беларускамоўнага адукацыйнага асяроддзя ва ўмовах білінгвізму; неабходнасць пошуку і ўкаранення інавацыйных метадычных распрацовак, накіраваных на забеспячэнне фунцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі і крытычнага аналізу эмпірычнага вопыту ўключэння ў яго вучняў вызначаюць сацыяльна-педагагічную, навукова-тэарэтычную і навукова-метадычную значнасць праблемы дысертацыйнага даследавання Н.У.Мурашкі.

### 3. Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону

Саіскальнікам прапанавана інтэрпрэтацыя паняцця «маўленчае адукацыйнае асяроддзе» як шматаспектнай педагагічнай катэгорыі і вызначаны яго структурныя кампаненты; выяўлены і абгрунтаваны магчымасці фальклорных твораў як сродку мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя; распрацаваны і эксперыментальна праверан мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору і модульная методыка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз вывучэнне фальклорных твораў як механізм яго функцыянавання; распрацавана аўтарскае метадычнае забеспячэнне фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў сродкамі фальклорных твораў на кампетэнтнаснай аснове, якое ўключае макетны ўзор праграмы факультатыўных заняткаў «Фальклорная скарбонка», метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў і метадычныя рэкамендацыі, аўтарскі сайт «Фальклорная скарбонка» (folkskarbonka.by).

### 4. Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі

Абгрунтаванасць асноўных высноў і рэкамендацый даследавання пацвярджаецца шматбаковым тэарэтычным аналізам псіхолага-педагагічных работ айчынных і замежных вучоных, прадстаўленай метадалогіяй на агульнанавуковым і канкрэтна навуковым узроўнях, лагічна і паслядоўна сфармуляванымі задачамі даследавання і выкарыстаннем для іх вырашэння адэкватных метадаў даследавання.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый саіскальніка вучонай ступені кандыдата педагагічных навук, вызначаецца апорай на шэраг асноўных палажэнняў розных падыходаў – філасофскаіх, лінгвістычных, педагагічных і псіхалагічных у апрабацыі мадэлі,што дае магчымасць рэкамендаваць аўтарскую методыку кожнай адукацыйнай установе.

Багатыя дадаткі дазваляюць станоўча ацаніць вялікую працу ў кірунку даказальнасці, абгрунтавальнаці і дакладнасці вынікаў і рэкамендацый аўтара ( ад А да Ц).

Вынікі статыстычнай апрацоўкі эмпірычных дадзеных па крытэрыю Т – Вілкоксана (N=115) даказалі статыстычную значнасць пазітыўных змянненяў якасных паказчыкаў у эксперыментальных класах.

## 5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні

*5.1. Навуковая значнасць* вынікаў даследавання: 1) з пазіцыі псіхолага-педагагічных і лінгвадыдактычных ведаў пададзена інтэрпрэтацыя паняцця «маўленчае адукацыйнае асяроддзе» як шматаспектнай педагагічнай катэгорыі і вызначаны яго структурныя кампаненты; 2) вызначаны і абгрунтаваны патэнцыял фальклорных твораў як сродку мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя; 3) тэарэтычна абгрунтавана і распрацавана структурна-функцыянальная мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору; 4) распрацавана і эксперыментальна апрабавана модульная методыка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі праз вывучэнне фальклорных твораў як механізма функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя; 5) распрацавана аўтарскае метадычнае забеспячэнне фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў сродкамі фальклорных твораў на кампетэнтнаснай аснове.

Упершыню ў Рэспубліцы Беларусь ў адукацыйнай прасторы Н.У.Мурашка паставіла і рашыла задачу стварэння методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай прасторы малодшых школьнікаў у класнай і пазакласнай дзейнасці.

Тэарэтычна абгрунтавана і апрабіравана ў педагагічнам эксперыменце структурна-функціянальная мадэль маўленчага асяроддзя з улікам асноўных палажэнняў сістэмнага асяроддзевага, камунікатыуна дзенастнага кампетэнтнаснага, лінгвакультуралагічнага і этнапедагагічнага падыходаў.

*5.2. Практычная значнасць* вынікаў дысертацыі і апублікаваных прац вызначаецца магчымасцю іх выкарыстання ў практыцы работы ўстаноў не толькі агульнай сярэдняй адукацыі, але спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку настаўнікаў пачатковых класаў. Вынікі даследавання апрабаваны ў практыцы працы настаўнікаў пачатковых класаў Рэспублікі Беларусь (ДУА «Сярэдняя школа № 196 г. Мінска імя В. К. Нікіфарава», ДУА «Сярэдняя школа № 153 А. К. Талая г. Мінска», ДУА «Пачатковая школа № 29 г. Мінска імя братоў Сянько», ДУА «Халопеніцкая сярэдняя школа імя М.

Багдановіча Крупскага раёна» Мінскай вобласці, ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. п. Бешанковічы імя І. І. Строчка» Віцебскай вобласці) – 5 актаў аб укараненні.

*5.3. Эканамічная значнасць.* Распрацаванае метадычнае забеспячэнне можа быць выкарыстана ў практыцы работы ўстаноў вышэйшай адукацыі, сярэдняй спецыяльнай адукацыі і павышэння кваліфікаці настаўнікаў пачатковых класаў.

*5.4. Сацыяльная значнасць* атрыманых вынікаў вызначаецца якасна іншай асобай выпускніка І ступені агульнай сярэдняй адукацыі, здольнай да далейшага актыўнага гарманічнага развіцця на аснове нацыянальнай самасвядомасці як усведамлення адказнасці за лёс краіны; каштоўнаснага стаўлення да Радзімы, культурнай спадчыны і традыцый, гістарычных дасягненняў.

*5.5. Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў дысертацыі.* Матэрыялы даследавання могуць паслужыць асновай пры распрацоўцы канцэптуальных палажэнняў методыкі выкладання на ўроках па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» і ў межах аб’яднання па інтарэсах ці факультатыўных заняткаў; выкарыстоўвацца для падрыхтоўкі педагагічных кадраў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах па спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» і для павышэння кваліфікацыі настаўнікаў пачатковых класаў, выкладчыкаў педагагічных УВА.

## 6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку

Па тэме дысертацыі апублікаваны 21 праца: 6 артыкулаў у навуковых часопісах, уключаных у пералік ВАК, а таксама 2 артыкулы ў навуковых часопісах, 11 артыкулаў у матэрыялах навукова-практычных канферэнцый, 2 метадычныя дапаможнікі. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 255 старонак (15,64 аўт. арк.).

## 7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК

Дысертацыйнае даследаванне аформлена ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад’яўляюцца да афармлення кандыдацкіх дысертацый..

## 8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе

Дысертацыя Н.У Мурашкі выканана самастойна і ўяўляе сабой завершаную навуковую працу, якая змяшчае новыя, навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя і эксперыментальныя вынікі і сведчыць аб адпаведнасці навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі).

## 9. Заўвагі па дысертацыі

9.1. Трэба патлумачыць саіскальніку інфармацыю аб тым, што ён адносіць сваю мадэль працэсу "… стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору…" да пэўнай тыпалогіі. Чым яна адрозніваецца ад іншых мадэляў?

9.2. Чаму некаторыя працы апублікаваны ў Рэспубліцы Казахстан у Астане за мяжой на беларускай мове (7а, 15а, 16а, 17а)?

9.3. Ці патрабавала эксперыментальная праца афіцыйнага ўзгаднення з дзяржаўнымі праграмамі? У якой форме адбываліся змены зместу адукацыі ў эксперыментальным класе?

9.4. У перспектыве магчыма было бы раскрыць праблему падрыхтоўкі выкладчакаў ВНУ, каледжаў, якія рыхтуюць педагагічныя кадры, працуюць ва ўстановах сярэдняй адукацыі і ўстановах пасля дыпломнай адукацыі і перападрыхтоўкі.

Нашы заўвагі не маюць намеру сведчыць аб негатыўных адносінах апанента да зместу дысертацыі. Навуковай радзе прадстаўлена самастойна выкананая дысертацыя, якая, магчыма, зробіць вялікі ўклад у перабудову ў чымсці адукацыйнай прасторы. Саіскальнік Н.У.Мурашка адпавядае навуковай кваліфікацыі саіскальніка навуковай ступені, на якую яна прытэндуе.

## 10. Вывады

Вышэйпададзенае дазваляе нам адзначыць, што дысертацыя Н.У.Мурашкі адпавядае спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі), адказвае патрабаванням ВАК РБ, якія прад'яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый. Вучоная ступень кандыдата педагагічных навук можа быць прысвоена саіскальніку Н.У. Мурашцы за:

- вызначэнне з пазіцыі псіхолага-педагагічных і лінгвадыдактычных ведаў сутнасці маўленчага адукацыйнага асяроддзя, якое, выступаючы разнавіднасцю адукацыйнага, уяўляе сабой комплекс умоў і мерапрыемстваў, спецыяльна сканструяваных у навучальнай установе, накіраваных на ўзнаўленне натуральнага моўнага асяроддзя і фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі як якаснага паказчыка маўленчай і камунікатыўнай дзейнасці малодшых школьнікаў, і яго структуры, якая прадстаўлена матывацыйным, кагнітыўным, дзейнасным і рэфлексіўным кампанентамі;
- выяўленне і абгрунтаванне патэнцыялу фальклору як сродку мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя, прадстаўлены ў трох ракурсах: мэтавым (уплыў на каштоўнасна-мэтавыя ўстаноўкі і матывы авалодвання беларускай мовай); змястоўным (адлюстроўвае асаблівасці ўплыву яго зместу на фарміраванне маўленчых і камунікатыўных уменняў, уяўленняў пра нацыянальную культурную спадчыну); дзейнасным (авалоданне вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці і актывізацыя камунікатыўных уменняў праз творчую і гульнёвую дзейнасць);
- распрацоўку структурна-функцыянальнай мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў школах з рукай мовай навучання і выхавання, якая адлюстроўвае яго

кампаненты і ўключае наступныя структурныя блокі: мэтавы, рэгулятыўны, змястоўны, працэсуальны і выніковы;

- распрацоўку модульнай методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у працэсе вывучэння фальклорных твораў як механізма функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя, якая дазваляе рэалізаваць на практыцы мадэль яго стварэння сродкамі фальклору ва ўмовах устаноў адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання і складаецца з трох модуляў: аналітыка-дыягнастычнага, змястоўна-дзейнаснага і рэсурсна-падтрымліваючага;
- распрацоўку на кампетэнтнаснай аснове з улікам практыка-арыентаванасці навучання аўтарскага метадычнага забеспячэнне фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў сродкамі фальклорных твораў, якое ўключае: праграму аб’яднання па інтарэсах «Фальклорная скарбонка»; метадычны дапаможнік для настаўнікаў «Вывучэнне фальклорных твораў на ўроках беларускай мовы і беларускай літаратуры (літаратурнага чытання): 2 клас»; метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў у працэсе рэалізацыі адукацыйных тэхналогій у вучэбнай і пазаўрочнай дзейнасці, мультымедыйныя прэзентацыі і раздатачныя матэрыялы да іх; метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў у працэсе рэалізацыі інтэрактыўных метадаў навучання ў вучэбнай і пазакласнай дзейнасці, мультымедыйныя прэзентацыі, дэманстрацыйныя і раздатачныя матэрыялы да іх; метадычны дапаможнік для настаўнікаў «Фальклорная скарбонка: казачная гасцёўня»; сцэнарыі правядзення беларускіх народных святаў і абрадаў, мультымедыйныя прэзентацыі, дэманстрацыйныя і раздатачныя матэрыялы да іх; аўтарскі сайт «Фальклорная скарбонка» (folkskarbonka.by).

Афіцыйны апанент, доктар
педагагічных навук, прафесар В.П.Таранцей

Аддзел упраўлення персаналам

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ:
Заместитель начальника
отдела управления персоналом
учреждения образования «Гродненский
государственный университет
имени Янки Купалы»
О.И. Циунчик